# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 20 мая 1999 года, чацвер, № 10 (1802)


НАВІНЫ НАВУКІ

## ПРЭМІІ ЛЕПШЫМ

У наш час асабліва востра стаіць пытанне аб прафесійнай падрыхтаванасці і адукаванасці работнікаў усіх сфер дзейнасці грамадства. Падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі (кандыдатаў і дактароў навук) у такіх умовах набывае асаблівае значэнне. Дзякуючы сістэме мер па стымуляванні дзейнасці па падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў БДУ за апошнія два гады назіраецца рост паказчыкаў у гэтай галіне. Вялікую ролю тут адыгрывае эканамічнае стымуляванне (прэміраванне) аспірантаў і дактарантаў за поспехі, дасягнутыя падчас навучанні. На пасяджэнні Савета па НДРСА БДУ было прынята рашэнне аб прэміраванні ў рамках адпушчаных сродкаў у павялічаным памеры дактарантаў і аспірантаў, якія дасягнулі найлепшых вынікаў у навукова-даследчай і грамадскай дзейнасці за І і ІІ кварталы 1999 года.

Сярод дактарантаў найбольшых поспехаў у навукова-даследчай дзейнасці дасягнулі Я.Я. Жук (факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі), В.Г. Шадурскі (факультэт міжнародных адносін), Я.К. Кулікоў (геаграфічны факультэт), В.І. Бахцін (фізічны факультэт), В.А. Вараб'ёў (факультэт філасофіі і сацыяльных навук).

Сярод аспірантаў трэцяга года навучання наблізіліся да завяршэння дысертацыйных работ Дз. Шуляеў (фізічны факультэт), Дз. Ушакоў, М. Яцкоў (факультэт радыёфізікі і электронікі), С. Вайцяховіч (хімічны факультэт), А. Касцевіч, А. Платонаў (факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі), П. Плашчынскі (механіка-матэматычны факультэт), В. Гарбач (факультэт журналістыкі), Н. Скок, Л. Голубева (юрыдычны факультэт), С. Рагач (гістарычны факультэт), Н. Глушакова (кафедра сусветнай і айчыннай гісторыі).

Сярод аспірантаў другога года навучання найбольш актыўна займаліся навукова-даследчай і грамадскай дзейнасцю Г. Кукрак, Ю. Яшчанка (механіка-матэматычны факультэт), І. Сарока, С. Сталеўская (факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі), М. Якутовіч (фізічны факультэт), Дз. Талапін (хімічны факультэт), Т. Мальцэвіч (філалагічны факультэт), Т. Паставалава (юрыдычны факультэт), Дз. Шавялёў, В. Кірвель (факультэт міжнародных адносін).

Рэктарат, упраўленне падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі, аддзел аспірантуры і дактарантуры віншуюць вышэйназваных дактарантаў і аспірантаў з поспехамі ў навукова-даследчай дзейнасці і заслужанымі прэміямі. Мы таксама выказваем падзяку навуковым кіраўнікам і кансультантам прэміраваных аспірантаў і дактарантаў за добрасумленную працу.

*К. КАРОСЦІК,*
*начальнік упраўлення падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі БДУ*

КАНФЕРЭНЦЫІ

## СТАРОНКІ ВАЕННАЙ ГІСТОРЫІ

Студэнты гістарычнага факультэта разам з прадстаўнікамі БДПУ імя М. Танка і аддзела ваеннай гісторыі Беларусі НАНБ удзельнічалі ў навукова-тэарэтычнай канферэнцыі, прысвечанай 55-годдзю вызвалення Беларусі. Гэтая падзея адбылася 6 мая ў БДПУ. Адна з дзвюх секцый (кіраўнікі К.І. Козак, А.А. Мігунова) была практычна цалкам скамплектавана са студэнтаў гісторыка-архіўнага аддзялення і кафедры новай і навейшай гісторыі Беларусі.

На пленарным пасяджэнні адбыліся выступленні прарэктара БДПУ В.І. Талкачова, які адзначыў паспяховасць удзелу ў канферэнцыі шырокага кола студэнтаў БДУ, Героя Савецкага Саюза, доктара, прафесара Дз.П. Жмуроўскага — па пытаннях інтэрнацыяналізму і дружбы народаў СССР у час вайны, загадчыка аддзела Інстытута гісторыі НАНБ А.М. Літвіна — аб стане навуковых распрацовак, прафесара БДПУ А.Ц. Караткевіча — аб удзеле беларускага насельніцтва ў антыфашысцкім супраціўленні. Не менш цікава прагучала выступленне доктара гісторыі і права Фернанда Бакура (Францыя) аб наяўных у Францыі крыніцах аб дзейнасці французскіх фарміраванняў у саставе германскай арміі на тэрыторыі Беларусі.

На секцыі былі прадстаўлены матэрыялы аб становішчы ваеннапалонных (Ю. Звераў, Ю. Задзіран), прапагандысцкай дзейнасці германскіх акупацыйных органаў (С. Кароль), дзейнасці БНС (С. Мацюк), СБМ (Г. Сідаровіч, Н. Бараўцова, Ю. Думбляўскас), БКА (І. Пестрак, Дз. Захарэвіч), вызваленні Чырвонай Арміяй Беларусі (Н. Станкевіч) і інш. Гэтыя паведамленні зрабілі пераважна добрае ўражанне аб узроўні студэнцкай распрацоўкі гэтай тэматыкі ў рэчышчы новых метадаў гістарычнага даследавання, увядзення ў навуковы зварот архіўных дакументаў. Гэта спрыяла і дыскусіі з удзелам А.М. Літвіна, У.Ф. Ладысева і аднаго з арганізатараў канферэнцыі загадчыка кафедры БДПУ А.А. Кавалені.

Вырашана выдаць матэрыялы канферэнцыі ў якасці дапаможніка для студэнтаў і выкладчыкаў па пытаннях Вялікай Айчыннай вайны.

*К. І. КОЗАК,*
*дацэнт кафедры крыніцазнаўства і музеязнаўства гістарычнага факультэта БДУ*

ВЫ ЧУЛІ?

## "Мы рождены для вдохновенья..."

Усім студэнтам, асабліва з філфака, даводзіцца чытаць шмат праграмнай літаратуры. Таму часам мы не маем жадання прачытаць творы нават нашых любімых аўтараў. Але тут на дапамогу нам ідуць педагогі-арганізатары разам з сацыяльнымі педагогамі інтэрната № 7 БДУ, якія рыхтуюць для нас літаратурныя вечарыны.

Пушкінская вечарына-конкурс запрасіла да сябе ўсіх аматараў яго паэзіі. Тыя, хто быў найбольш упэўнены ў сваіх ведах наконт жыццёвага і творчага шляху А.С. Пушкіна, аб'ядналіся ў тры каманды. Займальна тое, што адну з іх нават саставілі мужныя хлопцы з механіка-матэматычнага факультэта.



Педагогі здолелі стварыць сапраўдную старадаўнюю рамантычную атмасферу пры дапамозе свечак у падсвечніках, музыкі Свірыдава і Чайкоўскага, партрэтаў Пушкіна з яго блізкімі. Але ўдзельнікі камандаў таксама падрыхтавалі незвычайныя касцюмы, якія адпавядалі пушкінскай эпосе. Ад духмянага чаю і пірага павявала цеплынёй і хатняй утульнасцю.

Усе конкурсы праводзіла метадыст навукова-метадычнага аддзела фундаментальнай бібліятэкі БДУ Людміла Іванаўна Янковіч. І менавіта яна прыдумала назвы для конкурсаў "Собратья по перу", "Мгновенно твой проснулся гений" ці "Что в имени тебе моём", якія праходзілі надзвычай цікава. А для астатніх гледачоў Людміла Іванаўна падрыхтавала гульню "Я вас узнал", пасля якой адбылася музычная паўза.

А добры настрой і захапленне ўсіх прысутных ад вечарыны ўвасобіліся на памятнай фотакартцы. Затым каманды атрымалі невялікія падарункі. Але нікому не хацелася пакідаць утульнай гасцёўні, у якой, здаецца, быў сам Пушкін. Таму нам хацелася б выказаць падзяку арганізатарам вечарыны "Мы рождены для вдохновенья", якая падарыла нам шмат цудоўных і радасных успамінаў.

*Вольга УСЦІМЕНКА,*
*студэнтка І курса філалагічнага факультэта БДУ*


*Матэрыял аб А. С. Пушкіне чытайце таксама на стар. 7*

СЕМІНАРЫ

# АБ МІНУЛЫМ І БУДУЧЫМ ДЫПЛАМАТЫЧНАГА ПРАТАКОЛУ НА БЕЛАРУСІ

Дыпламатычны пратакол — не толькі сукупнасць правіл, якія датычацца ажыццяўлення розных дыпламатычных актаў, але і адна з ключавых умоў для поспеху перамоў, міжнародных форумаў і адпаведна для ўсталявання мірных адносін, дружбы і паразумення між краінамі і народамі. Гэтая думка праходзіла чырвонай ніткаю праз выступленні ўдзельнікаў рэспубліканскага семінару "Дыпламатыя і дзяржаўны пратакол на Беларусі", які ладзіўся на факультэце міжнародных адносін 28 красавіка. Ініцыятарам і арганізатарам правядзення мерапрыемства выступіла кафедра дыпламатычнай і консульскай службы факультэта міжнародных адносін БДУ, якая "з нуля" пачала распрацоўку навучальных праграм па дыппратаколе. Яна ж з'яўляецца і галоўным навуковым цэнтрам па гэтых праблемах. Аб вопыце выкладання на факультэце гэтых дысцыплін удзельнікам паведаміў загадчык кафедры дацэнт Л.В. Лойка. Спыніўся ён на праблемах даследчай працы, у прыватнасці на стварэнні нацыянальнага "Дыпламатычнага слоўніка" і іншых даведачных выданняў. Аб асаблівасцях вучэбнага працэсу ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце, дзе вядзецца перападрыхтоўка дыпламатычных спецыялістаў для заняцця вышэйшых дыпламатычных пасад, расказаў загадчык кафедры знешняй палітыкі і дыпламатыі былы Надзвычайны і Паўнамоцны пасол СССР В.С. Смірноў.

Амаль усе паведамленні першага пасяджэння былі прысвечаны гісторыі і этыкету ў Вялікім княстве Літоўскім, Рэчы Паспалітай, Маскоўскай дзяржаве. Нягледзячы на тое, што гаворка ішла аб падзеях сівой мінуўшчыны, выступленні былі сустрэты з жывой, "сучасный" зацікаўленасцю: адносіны паміж сярэднявечнымі суседзямі ў найбольшай ступені залежалі менавіта ад правільнасці выканання пратакольных звычаяў. Памылка — вайна. Гэта прымушала самым уважлівым чынам ставіцца да самых дробных дэталяў у арганізацыі візітаў пасольстваў, прыёмаў, перамоў. Да кожнай краіны Захаду і Усходу існаваў "уласны падыход" з улікам нацыянальных традыцый. Паміж кіраўнікамі феадальных манархій панаваў дух роднасці, братэрства ("вакабула генцылітацыс").

Падчас другога пасяджэння размова перайшла да праблем сучаснага стану дзяржаўнага пратаколу на Беларусі. Галоўныя з іх былі акрэслены доктарам палітычных навук К.М. Кунцэвічам, кандыдатамі навук А.Д. Лебедзевым, Г.М. Міхалькевічам, І.А. Фількевічам, М.Э. Часноўскім: недахоп высокакваліфікаваных кадраў у сферы знешнепалітычнага кіравання, адсутнасць канцэпцыі дзяржпратаколу. Непрыемныя, часам камічныя памылкі ў дыпламатычнай практыцы тлумачацца маладым пакуль узростам нашай дзяржаўнасці. Адзін з магчымых варыянтаў — распаўсюджанне культуры пратаколу на шырэйшыя колы грамадзян праз увядзенне курсаў дзяржпратаколу і этыкету ва ўсіх ВНУ краіны. Галоўная мэта распачатай працы — стварэнне нацыянальнай сістэмы пратаколу, якая б адпавядала і патрэбам, і магчымасцям Беларусі, — павінна быць дасягнута праз супрацоўніцтва вядучых спецыялістаў з усіх зацікаўленых ведамстваў. Прагучала прапанова і аб правядзенні "круглага стала" з удзелам дыпламатычных прадстаўнікоў замежных краін у Рэспубліцы Беларусь. Але ўжо гэтая першая сустрэча навукоўцаў рэспублікі, якая дазволіла акрэсліць сутнасць сучаснага стану праблемы, стала ўдалай.

*Леанід ФЯДОТАЎ,*
*студэнт факультэта міжнародных адносін*

ЮБІЛЕІ

# ДЗВЕ "ПЯЦЁРКІ" Ў ЖУРФАКА

Надыходзячай восенню факультэту журналістыкі споўніцца 55 год. Скептык назаве гэтую дату някруглай. Аднак дэкан журфака Васіль Пятровіч Вараб'ёў лічыць 55-годдзе сімвалічным супадзеннем:

— Гэта ж дзве "пяцёркі". Для навучальнай установы самае сапраўднае свята.

Падрыхтоўка да юбілею ўжо сёння ідзе поўным ходам. Студэнты прымаюць удзел у распрацоўцы эскіза эмблемы факультэта. Чацвёрты курс рыхтуе да друку вучэбную газету "Журналіст" і альманах "Аўтограф-17". А слухачы курса "Рэдактар рэкламы" пад кіраўніцтвам выкладчыка Алены Маеўскай складаюць слоганы, адзін з якіх, магчыма, стане, дэвізам факультэта журналістыкі на ўсе астатнія гады.

Дарэчы, сярод прапанаваных студэнтамі слоганаў сустракаюцца і даволі арыгінальныя:

"Разумных людзей многа, таленавітых — адзін факультэт", "Журфак заўсёды ў курсе. З 1-га курса". Маюцца і ў некаторым сэнсе пагрозлівыя: "Журфак — сіла, ФПМ — магіла".

Жарты жартамі, але галоўнай усё ж застаецца сама арганізацыя свята. У планах дэканата — правядзенне міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, куды будуць запрошаны госці не толькі з краін СНД, але і з бліжэйшага еўрапейскага замежжа. Пройдзе на факультэце і ганаровы сход, і студэнцкі "капуснік", і дыскатэка.

— У святочныя дні, — расказвае Васіль Пятровіч Вараб'ёў, — мы не толькі ўспомнім добрым словам тых выкладчыкаў, якія закладвалі першыя "цаглінкі" ў фундамент журфака. Не толькі запросім усіх нашых выпускнікоў, на чыіх плячах трымаецца, па сутнасці, сістэма сродкаў масавай інфармацыі. Але і паспрабуем вызначыць будучы вобраз факультэта журналістыкі. Вырашым, што з таго, што прайшло выпрабаванне часам, узяць у наступнае пяцігоддзе.

Мяркуючы па ўсім, юбілей пройдзе на "пяць". І атмасфера будзе, як заўсёды, добрая, утульная. Адным словам, святочная.

*Вольга РОЗУМ*

Савет ветэранаў універсітэта выказвае падзяку рэктарату БДУ і асабліва рэктару А.У. Казуліну, а таксама аддзелу выхаваўчай работы з моладдзю за чулае і ўважлівае стаўленне да ветэранаў, за праяўленую да іх увагу ў сувязі з 54-й гадавінай разгрому фашысцкай Германіі.

*Па даручэнні Савета ветэранаў Т. ДУДАРАВА*

ВЫСТАВЫ

# ДЗІВОСНЫЯ ФАРБЫ ВЯСНЫ

З 11 па 14 мая ў інтэрнаце № 5 БДУ адбылася выстава эцюдаў мастака Юрыя Макарава. Арганізатарам мерапрыемства выступіў нядаўна створаны Апякунскі савет студгарадка Белдзяржуніверсітэта, які займаецца выхаваннем моладзі, апякае навучэнцаў з малазабяспечаных сем'яў і сірот. Разам з мастаком Юрыем Макаравым гэты савет плануе стварыць студыю выяўленчага мастацтва. Праўда, існуе праблема. Выканаўчы дырэктар савета Ірына Таўстых паведаміла, што задума патрабуе вялікіх грошай, якіх у Апякунскага савета няма. Пакуль вырашана дапамагаць студэнтам палатном, пэндзлямі і фарбай.

Жывапісец Юрый Макараў — член Беларускага саюза мастакоў. Яго працы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі, у Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Міністэрстве культуры Расіі. "Мой жывапіс — гэта жывапіс майго пачуцця. Колер — сімвал пачуцця, які здольны паказаць шматлікія нюансы душэўнага настрою", — так пісаў мастак. Сапраўды, яго экспазіцыя эцюдаў "Бэз" захапляе найперш разнастайнасцю фарбаў: ружовага, бэзавага, зялёнага, сіняга і фіялетавага адценняў. Глядзіш на намаляваныя кветкі і, здаецца, адчуваеш духмяны водар вясны, пах зямлі, з'яўляецца пачуццё еднасці з прыродай і Сусветам. Галінкі бэзу на фоне сіняй, зялёнай і фіялетавай прасторы перадаюць позірк вясны, жыцця і кахання. У яго палотнах знаходзіш душэўны спакой і адпачынак ад паўсядзённасці.

*Кацярына БУРЫК*

**А Ў НАС! А Ў ВАС?**

# А МУЗЫКА ГУЧЫЦЬ...

6 мая — напярэдадні Дня Перамогі — як падарунак ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і ўсім аматарам і знаўцам сапраўднай музыкі адбыўся канцэрт Народнага аркестра народных інструментаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Аркестр жыве, дзейнічае і дорыць людзям хвіліны асалоды вось ужо больш за паўстагоддзя (з 1946 года). За вялікі ўклад у справу прапаганды музыкі ў 1966 годзе аркестру было прысвоена званне народнага. З 1984 года мастацкі кіраўнік і дырыжор калектыву — Алег Шапялевіч.

У аркестры (інструментальны склад: цымбалы прымы, домры альтавыя і басовыя, балалайкі-секунды і альты, акардэоны, баяны, бас-гітары, ударныя інструменты) ёсць некалькі рэпертуарных накірункаў: пералажэнні класічнай музыкі, апрацоўкі беларускіх і рускіх народных песень, песні народаў свету, старадаўнія рамансы, арыгінальныя творы беларускіх кампазітараў у пералажэнні для такога саставу аркестра.

Аркестр карыстаецца папулярнасцю як у рэспубліцы, так і па-за яе межамі. Мяркуйце самі: май 1986 года — гастролі ў Польшчы, якія атрымалі шмат водгукаў аб высокім прафесіяналізме аркестра ў мясцовай прэсе; сакавік 1989 года — лаўрэат IX Мінскага гарадскога конкурсу; май 1993 года — уладальнік Гран-пры фестывалю студэнцкай моладзі Рэспублікі Беларусь у Віцебску; май 1994 года і чэрвень 1995 года — удзельнік буйных Міжнародных музычных фестываляў у горадзе Бельфор (Францыя), і зноў мноства фотаздымкаў і спрыяльных водгукаў у французскай прэсе; жнівень 1994 года — пераможца буйнога Міжнароднага фестывалю духавой музыкі ў горадзе Роскільд (Данія); 1998 год — лаўрэат Першага Рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці "Беларусь — мая песня".

Ну, а ў той вечар у канцэртнай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі як ніколі адчувалася адзінства публікі, аркестра, дырыжора і салістаў: Наталлі Бярэзінай — сапрана, салісткі Белдзяржфілармоніі, якая выконвала беларускія народныя песні "Зязюленька" і "Каціліся чорна галка", а таксама вальс Джульеты з оперы "Рамэа і Джульета" Ш. Гуно і "Песню Сальвейг" Э. Грыга; Канстанціна Міхальскага — унікальны контр-тэнар, хормайстр Народнай Акадэмічнай харавой капэлы БДУ, які выконваў арыёза воіна з кантаты "Масква" П.І. Чайкоўскага; Алега Ціханенкі — барытон, прафесар факультэта радыёфізікі і электронікі БДУ, які выконваў рамансы "Не шукай у начы зорку даўніх гадоў", "Лістапад" і "Асенні раманс" (музыка А. Шапялевіча на словы Л. Эміліта); Алега Гардынца — бас, лаўрэат міжнародных конкурсаў, саліст Дзяржаўнага Акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, які выконваў песню "Дым" Д. Керна на словы О. Харбара, "Самотны малыш" Э. Бернета на словы Д. Нортана і М. Уотсана, "Цень тваёй усмешкі" Д. Мендэла на словы П. Вебстэра.



Віртуозна былі выкананы II і III часткі канцэрта для гітары з аркестрам М. Кастэльнуова-Тэдэска. Салiраваў на гітары Павел Бельскі, студэнт Беларускай Акадэміі музыкі.

Гучалі і дарагія нашаму сэрцу "Паланэз" М. Агінскага, "Сумны вальс" Я. Сібеліўса, "Венгерскі танец № 1" І. Брамса, канцэртная п'еса на тэму рускай народнай песні "Выйду я на вуліцу" В. Гарадоўскай, "Вясейская полька" ў апрацоўцы А. Шапялевіча, уверцюра да кінастужкі "Утаймаванне агню" А. Пятрова, "Пляска скамарохаў" П.І. Чайкоўскага з музыкі да веснавой казкі А. Астроўскага "Снягурка" і, безумоўна, вядомыя кожнаму, хто хоць крыху цікавіцца музыкай, п'есы Д. Гершвіна.

Сапраўды, усе, хто сядзеў у той майскі вечар у зале, сталі чысцейшымі душой і сэрцам, сталі дабрэйшымі і міласэрнымі — такіх узнёслых твараў я асабіста ўжо даўно не бачыла. Дзве гадзіны праляцелі як дваццаць хвілін — на адным дыханні, на адным узмаху дырыжорскай палачкі.

А музыка гучыць, нягледзячы ні на што.

*Кацярына САЛАДУХА,*
*інспектар упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю*

**У НАШЫМ ДВАРЫ**

# ХТОСЬЦІ ПАВІНЕН ЗМАГАЦЦА СА СМЕЦЦЕМ

На Беларусі існуе шмат экалагічных арганізацый. Але, на жаль, іх дзейнасць часам адарвана ад рэальнага жыцця. Засяроджанасць толькі на глабальных праблемах перашкаджае звярнуць увагу на так званыя дробязі, з якіх усё і пачынаецца. У маі гэтага года пры Мінскім гаркаме БПСМ была створана Асацыяцыя экалагічных клубаў. Яе арганізатары вырашылі аб'яднаць тых хлопцаў і дзяўчат, якія цікавіліся экалагічнымі праблемамі, хваляваліся сам-насам, каб з гэтай заклапочанасці была нейкая карысць.

Старшынёй новай арганізацыі прызначаны Юрый Малышка, студэнт 3-га курса БДУ, на якога, відаць, і ляжа ўвесь цяжар аб'яднаўчай дзейнасці. Акцэнт хутчэй за ўсё будзе зроблены на экалагічнай адукацыі (большасць членаў Асацыяцыі — навучэнцы і школьнікі) і на экалагічным маніторынгу. Арганізацыя плануе стварыць экалагічную карту Мінска, на якую будуць нанесены ўсе забруджаныя раёны (ад заводскіх да тых, на тэрыторыі якіх знаходзяцца буйныя сметнікі). У 80-я гады такую карту спрабавалі стварыць на біяфаку БДУ, але беспаспяхова.

Пакуль жа ўвасабляюцца ў жыццё больш празаічныя рэчы: юныя эколагі ачышчаюць Севастопальскі і Лошыцкі паркі ад смецця, а таксама ўзнаўляюць парк у Нясвіжы. Хтосьці ж павінен гэтым займацца...

*Валерыя АЎСЯНІК*

**ПАДПІСКА-99**

## ВЕСНІК БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

Працягваецца падпіска на перыядычныя выданні на другое паўгоддзе 1999 года. Падпісная цана часопіса "Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта" такая:

**Серыя III** (індэкс 74853) — гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, эканоміка, права (№ 2, ліпень; № 3, лістапад) — 200 000 рублёў;

**Серыя IV** (індэкс 74854) — філалогія, журналістыка, педагогіка (№ 2, жнівень; № 3, снежань) — 200 000 рублёў;

**Серыя I** (індэкс 74851) — фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 3, верасень) — 100 000 рублёў;

**Серыя II** (індэкс 74852) — хімія, біялогія, геаграфія (№ 3, кастрычнік) — 100 000 рублёў.

Часопіс распаўсюджваецца па падпісцы і ў рознічны продаж не паступае.

**ШТАБ ГА ПАВЕДАМЛЯЕ**

# ВУЧЫМСЯ СЯБЕ АБАРАНЯЦЬ

6 мая 1999 года ва універсітэце была праведзена аб'ектавая трэніроўка па грамадзянскай абароне, на якой былі адпрацаваны пытанні арганізацыі абароны пастаяннага саставу і студэнтаў з умоўнай сітуацыяй аварыі на хімічна небяспечным аб'екце з выкідам моцнадзейных атрутных рэчываў.

Мэта вучэнняў для кіруючага саставу — праверка рэальнасці плана на мірны час, арганізацыя мерапрыемстваў па выкананні задач у надзвычайных сітуацыях мірнага часу, набыццё практычнага вопыту ў выкананні мерапрыемстваў павышанага і надзвычайнага рэжымаў функцыянавання грамадзянскай абароны.

Перад камандна-кіруючым і асабовым саставам невaенізаваных фарміраванняў грамадзянскай абароны стаялі наступныя задачы: вызначэнне ўзроўню гатоўнасці па ацэнцы абстаноўкі, якая склалася ў выніку надзвычайнай сітуацыі, і прыняцце адпаведных рашэнняў пры выкананні задач, набыццё практычных уменняў у прывядзенні фарміраванняў у гатоўнасць.

Для пастаяннага саставу і студэнтаў былі пастаўлены наступныя мэты: навучыцца правільна дзейнічаць пры атрыманні сігналаў па грамадзянскай абароне, умела карыстацца індывідуальнымі і калектыўнымі сродкамі абароны.

Пры выкананні практычных дзеянняў лепшых вынікаў дасягнулі асабовы састаў пункта выдачы сродкаў індывідуальнай абароны, начальнік пункта выдачы В.К. Ішуцін, і санітарнае звяно, камандзір сандружыны А.У. Шылінская. Кіраваў вучэннямі прарэктар па агульных пытаннях, намеснік начальніка грамадзянскай абароны Уладзімір Германавіч Булаўка.

*М. ГЕДРЭВІЧ,*
*начальнік штаба грамадзянскай абароны*

# ПАЧУЦЬ ЗЯМЛІ МАТУЛІН ГОЛАС

...Калі пачалася вайна, яны былі яшчэ дзецьмі: Марыйцы — крыху больш за дзесяць, а яе стрыечнаму брату Вадзіму ішоў трынаццаты. Напярэдадні Вадзім жыў разам з імі ў пасёлку Пешкава-1, што пад Магілёвам. Бацька Марыйкі — Сцяпан Іванавіч Гураў — усё жыццё быў ваенным. У той першы перадваенны год ён быў намеснікам начальніка курсаў па ўдасканаленні каманднага саставу. Пляменніка Вадзіма, які закончыў у іх пасёлку чарговы навучальны год, адправілі на службовай машыне ў Мінск да маці — пераведацца. Але ж ні Марыйка, ні



Кацярына Карпенка.
Лос-Анджэлес. ЗША. 90-я гады

Вадзім не ведалі, што сустрэнуцца яны ўжо толькі праз пяцьдзесят год. Сцэнарый іх жыцця напісала вайна.

Марыйцы давялося жыць у Чалябінску, куды іх эвакуіравалі. Разам са сваімі аднагодкамі, такімі ж горкімі дзецьмі, працавала на ваенным заводзе. Тут яны выконвалі, здавалася, зусім нескладаную работу: перамешвалі выбуховыя рэчывы для снарадаў.

"...Мы разумелі смяртную небяспеку той справы, якой займаліся", — успамінае мінчанка Марыя Сцяпанаўна Гурава: пры нязначнай неасцярожнасці мог адбыцца выбух (на жаль, здаралася і такое...). Кожны — у любы момант! — мог быць і скалечаным, і забітым... Але ніхто не скардзіўся. Працавалі да знямогі, да самазабыцця.

... Вадзіма разам з маці Кацярынай Леанідаўнай вайна закінула зусім у процілеглы бок ад Мінска. Яны трапілі ў Германію, дзе працавалі ў рабочым лагеры. Пасля вызвалення амерыканскімі войскамі па законе аб уцекачах эмігрыравалі ў ЗША.

У Амерыцы Вадзім Карпенка скончыў два універсітэты. Доўгі час працаваў у карпарацыях ваенна-касмічнай прамысловасці. Цяпер у адстаўцы. Яго маці, Кацярына Леанідаўна, якая скончыла да вайны хімічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, уладкавалася на службу ў фінансавую карпарацыю. (Напачатку разам з сынам зараблялі на кавалак хлеба на цытрусавых плантацыях...) Працавала бездакорна, але падлягала звальненню першай — беларускі акцэнт не дужа падабаўся амерыканскім начальнікам...

Пасля вайны яны доўга шукалі адзін аднаго. Сястра Марыя Сцяпанаўна пісала запыты ў розныя інстанцыі з Беларусі, а брат Вадзім Аляксеевіч вёў пошук з далёкай Амерыкі. Выніку не было. І толькі аднойчы — амаль праз 50 гадоў! — Вадзім Аляксеевіч праз свайго сябра з Ленінграда перадаў запыт на паштовае аддзяленне вёскі Брадзец Бярэзінскага раёна, дзе нарадзілася яго маці. І адтуль атрымаў доўгачаканы адказ. Вадзім Аляксеевіч даведаўся, што адна з яго стрыечных сясцёр жыве ў Шчучыне, а другая — у Мінску. Атрымаў вестку і пра тое, што ягоныя бацькі і дзед, якіх рэпрэсіравалі ў 30-я гады, былі рэабілітаваныя — пасмяротна... (Дзед быў святаром, а бацька — мастаком, калегам знакамітага Заіра Азгура.)

— На пачатку 90-х гадоў цётка Каця прыязджала да нас у Мінск, — успамінае Марыя Сцяпанаўна. — Калі яна пасля доўгага расстання ўбачыла мяне ў аэрапорце, не вытрымала — узрушана закрычала: "Гляньце, гэта ж мая пляменніца, а я ж яе маленькую насіла на руках!" Мы пацалаваліся і расплакаліся...

І Вадзіма яна пазнала адразу, хоць і не бачыла паўстагоддзя. Вадзім Аляксеевіч ужо некалькі разоў прыязджаў у Мінск. Прыязджаў з радасцю, прымаючы блізка да сэрца і праблемы Беларусі. А нядаўна яны з маці вырашылі дапамагчы айчыннай навуцы і канкрэтным яе прадстаўнікам. На хімічным факультэце, дзе да вайны вучылася Кацярына Леанідаўна, створаецца фонд Кацярыны Карпенка. Гэта дасць фінансавую магчымасць заахвоціць лепшых студэнтаў, аспірантаў і выкладчыкаў. Мяркуецца, што аналагічны фонд Вадзіма Карпенкі будзе створаны на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Белдзяржуніверсітэта. А пакуль вырашаюцца арганізацыйныя пытанні...

— Актыўна перапісваемся з Вадзімам Карпенкам, — расказвае дэкан хімічнага факультэта, прафесар Генадзь Браніцкі. — Вадзім Аляксеевіч — адукаваны і добразычлівы чалавек. Мы шчыра ўдзячны яму за да-



Вадзім Карпенка. У час вандроўкі ў Кітай. 90-я гады

памогу. Дзякуючы яго намаганням наш факультэт ужо атрымаў вельмі дарагія для нас камплекты двух падпісак часопісаў — "Прырода" і "У свеце навукі". Будзем вельмі ўсцешаны, калі ў нашым універсітэце запрацуюць фонды Карпенкаў. Асабіста я з вялікай удзячнасцю ўспрымаю гэтае высакароднае памкненне душы суайчыннікаў.

"Даведаўшыся аб рашэнні Вадзіма і цёткі Каці, я напісала ім у далёкую Амерыку, што ганаруся імі, — сказала падчас нашай размовы Марыя Сцяпанаўна і дадала: — А ўвогуле нічога звышвыключнага ў гэтым я не бачу.



Злева направа: Валянціна Івашкевіч (сястра Кацярыны Карпенка), Марыя Гурава (сястра Кацярыны Карпенка), Сцяпан Гураў (дзядзька Вадзіма Карпенкі), Марыя Гурава (пляменніца Кацярыны Карпенка)

Мусіць, таму, што беларусы — самыя душэў-
ныя і добрыя людзі на свеце".

Гэта ўласціва і самой жанчыне, і яе ро[д]ным. Такім жа добрым і шчырым быў і я[е] бацька — адзін з абаронцаў Брэсцкай кр[э]пасці. Ён перажыў і цяжкія раненні, і горь[кі] варожага палону, але не страціў любові д[а] Айчыны. Як і яго родныя за акіянам, што пр[а] паўстагоддзя адчулі прыцягненне родна[й] зямлі і пачулі яе матулін голас.

*Святлана ХОРС[...]*

СПОРТПЛЯЦОЎКА

# Юрфак – чэмпіён!

Яшчэ адзін футбольны чэмпіянат кануў у Лету. Неяк нават сумна, што не трэба спяшацца пасля заняткаў на стадыён, каб на бліжэйшыя чатыры гадзіны акунуцца ва універсітэцкі футбол.

Новаўведзены падзел камандаў на дзве лігі даў свой плён. У камандаў класам ніжэй кожны матч мог стаць апошнім, бо спаборніцтвы праходзілі па алімпійскай сістэме, гэта значыць з выбываннем. У вышэйшай лізе падабраліся больш-менш роўныя па класе каманды, таму і тут "прахадных" матчаў не было. Нават фізікі, якія пакінуць у наступным годзе клас мацнейшых, упіраліся ў кожнай сустрэчы.

Але варта больш падрабязна зірнуць на гульню камандаў.

Юрысты... Чэмпіёны мінулага года маглі б гуляць і лепш. Каманда крыху "здала", нават калі параўноўваць з мінулым першынством. Не кажучы ўжо пра каманду, якая гуляла некалькі гадоў таму і якую прыводзілі да перамогі Паша Лутовіч, Шалва Гегелія, Вова Матусевіч, калі знаходзіліся ў лепшай форме Сяргей Ільіч, Саша Сямашка.

Я ні ў якім разе не хачу сказаць, што юрфак зусім не той. Ён па-ранейшаму мацней за іншыя каманды. Але не на галаву, як было раней. Мне падаецца, што каманда страціла нейкую іскарку. Хлопцы ўжо не так часта радуюць сваіх прыхільнікаў цікавымі камбінацыямі. Каманда стала гуляць прасцей. У гэтым чэмпіянаце яе выратавалі толькі надзейныя абаронцы і "снайперы". Першыя не падпускалі сапернікаў да свайго варатара, які ўсё ж такі ўмудрыўся запхаць сабе пару-тройку мячоў. А "снайперы" пераважна дальнімі ўдарамі і пасля розыгрышу стандартных становішчаў вырашалі лёс матча.

Географы. Калі параўноўваць з мінулым годам, каманда даволі моцна "прыбавіла". З'явіўся малюнак гульні. Але самае галоўнае — ва універсітэце з'явіўся варатар. Аднак не такі, як большасць нашых галкіпераў (калі мяч ляціць нават міма варот, яны ўсё адно ўвапхнуць яго ў сетку), а сапраўдны, амаль прафесійны. Сяргей Пярчак — пакуль толькі першакурснік, але ўжо выцясніў у запас геафака абодвух варатароў зборнай БДУ. Застаецца толькі спадзявацца, што ён стане і ў вароты галоўнай каманды Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

І некалькі слоў пра яшчэ аднаго першакурсніка. Дзяніс Высоцкі ўвосень стаў лепшым бамбардзірам на чэмпіянаце сярод першых курсаў. І зараз "накляпаў" дастаткова мячоў. "Чалавекам-голам" яго яшчэ рана называць, але, калі не захварэе на "зорную" хваробу ці не кіне футбол, то з яго, можа, нешта добрае і атрымаецца.

Радыёфізікі. Каманда ўжо каторы год нічым асаблівым не выдзяляецца, але таксама каторы год знаходзіцца ўверсе турнірнай табліцы. З гэтай камандай гуляць даволі складана. З аднаго боку, радыёфізікі не даюць сапернікам гуляць у іх гульню, з другога — не навязваюць сваю. Вось і змагайся з імі як хочаш. Нават юрысты, і тыя згулялі з радыстамі ўнічыю.

Механіка-матэматычны факультэт ужо ў першай гульні паказаў зубы. Юрысты ледзь унеслі ногі: толькі адзін гол вырашыў усё. Па праўдзе кажучы, у гэтым матчы больш лагічным вынікам была б нічыя. Гульня праходзіла амаль роўна, з зусім невялікай перавагай матэматыкаў. Тады, як і ў наступных сустрэчах, мехмат спрабаваў гуляць праз цэнтральнага паўабаронцу Андрэя Сёмуху. А ў гэтага хлопца атрымліваецца ў апошнія гады многае. Ці мог бы гэты факультэт заняць сёлета больш высокае месца? Напэўна, здолеў бы. Але яму не пашчасціла з сапернікам і ў другім матчы. Гуляць першыя гульні з юрфакам і геафакам — гэта можа прытрызніцца ў самым жудасным кашмары. Пагатоў, географы, правёўшы невыразны матч з журналістамі (1:1 пры выдаленні ў журфака) і зрабіўшы паўторную мабілізацыю, сабралі на гэты раз у свае шэрагі ўвесь гонар свайго факультэта і былі гатовыя разарваць кожнага, хто стане на іх шляху. Да гэтага ўсё ішло. Хвілін за пяць да заканчэння другога тайма лік быў 5:1 не на карысць матэматыкаў. Але ў іх былі Сёмуха і Рабашчанка. А ў геафака не было ў варотах траўмаванага Сяргея Перчака. І толькі фінальны свісток ўратаваў геафак ад сораму. Агульны лік 5:4.

Журналісты. На першынстве не было больш тэхнічнай каманды. Але... Траўмы падкасілі палову футбалістаў. А магчыма, не толькі ў траўмах справа. Некалькі ігракоў каманды — прафесіяналы, і таму імкнуцца згуляць перш-наперш прыгожа. Хаця, на жаль, каб забіць гол, на нашым чэмпіянаце не абавязкова абводзіць паўкаманды сапернікаў, гуляць "у сценку", аддаваць перадачы пяткай. А хапіла б проста ўдарыць нават з цэнтра поля і трапіць у вароты. На жаль, гэтага ніяк не маглі зразумець журналісты.

Была і яшчэ адна загана ў журфакаўцаў. Амаль усе прымалі мяч стоячы. Ну не хацелі хлопцы бегаць у першых гульнях! Пасля таго як апошняга абаронцу камандзіравалі ў нападзенне, а правага асноўнага — у вароты (не пайшла гульня ў варатара), у гульні штосьці змянілася да лепшага. Але час ужо быў змарнаваны: крыўдныя паражэнні ад ФМА і мехмата не далі зборнай падняцца вышэй.

Філфак апынуўся ў рэшце рэшт на сваім месцы. Вышэй за журналістаў ён скочыць не змог, а апусціцца ніжэй ФМА было б несправядліва.

Факультэт міжнародных адносін — каманда зубастая. Калі збераже састаў, то, магчыма, у наступным годзе падымецца яшчэ вышэй.

А вось чаму праваліліся фізікі — і па сённяшні дзень застаецца загадкай.

Турнірнае становішча камандаў вышэйшай лігі:

1. Юрфак
2. Геафак
3. Радыёфізічны факультэт
4. Механіка-матэматычны факультэт
5. Журфак
6. Філфак
7. ФМА
8. Фізфак

Такім чынам, фізікі пакідаюць клас мацнейшых і ў наступным годзе складуць кампанію біёлагам і кітайскай камандзе. А іх месца зоймуць хлопцы з ФПМІ. Факультэт жа міжнародных адносін прайграў пераходную сустрэчу гістфаку і таму таксама пакідае лігу мацнейшых.

Лепшым бамбардзірам стаў Міхась Бандарэнка (журфак), лепшым ігракам — Андрэй Сёмуха (мехмат), лепшым варатаром — Сяргей Пярчак (геафак).

*Вольга КАЗДЗЕРКА*

СВЕТ ПРЫРОДЫ

# ХТО ЗРАБІЎ ГЭТА ПЕРШЫМ

"Я падазраю,— сказаў адзін біёлаг, — што мы не з'яўляемся тымі наватарамі, за якіх сябе прымаем, – мы ўсяго толькі перайманьнікі".

На самой справе, людзі-вынаходнікі часта проста паўтараюць тое, што расліны і жывёлы робяць ужо тысячагоддзі.

### КОМПАСЫ

Прыкладна ў XIII стагоддзі нашай эры людзі пачалі карыстацца прымітыўным компасам — магнітнай стрэлкай, якая плавае ў кубку з вадой. Аднак гэта не было нечым новым. Бактэрыі ўтрымліваюць ланцужкі часціц магнетыту, якія якраз маюць адпаведныя памеры, каб дзейнічаць у якасці компаса. Дзякуючы гэтаму яны адшукваюць асяроддзе, якому аддаюць перавагу. Магнетыт быў знойдзены і ў многіх іншых жывых арганізмаў, напрыклад у птушак, пчол, матылькоў і малюскаў. Як паказваюць эксперыменты, паштовыя галубы, вяртаючыся дадому, арыентуюцца па магнітным полі Зямлі. Цяпер агульнапрызнана, што пералётныя птушкі знаходзяць свой шлях таксама і з дапамогай магнітных компасаў, якія знаходзяцца ў іх галовах.

### СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

З даўніх часоў чалавек апрацоўвае зямлю і трымае свойскую жывёлу. Аднак намнога раней за яго мурашы-лістарэзы займаліся садоўніцтвам. У кампосце, які яны выраблялі з лістоты і свайго гною, яны вырошчвалі грыбкі, якія служылі ім ежай. Некаторыя мурашы трымаюць тлей як свойскую жывёлу, выдойваючы з іх салодкія выдзяленні і нават будуючы для іх жывёльныя памяшканні. Мурашы-жняцы запасаюць насенне ў падземных свірнах. Некаторыя жукі падразаюць мімозу. Сенастаўкі і суркі косяць, сушаць і назапашваюць сена.

### ІНКУБАТАРЫ

Хоць чалавек і будуе інкубатары для вываду маладняка з яек, але ён дайшоў да гэтага не першым. Марскія чарапахі і некаторыя птушкі адкладаюць свае яйкі для вывядзення птушанят у цёплым вулканічным попеле. Алігатары пакрываюць часам свае яйкі гніласнай зелянінай, каб стварыць цяпло. Аднак сапраўдным спецыялістам у гэтай галіне з'яўляецца самец глазчатай курыцы. Ён капае вялікую яму, запаўняе яе зелянінай і зверху засыпае пяском. Браджэнне раслiннасці абаграе кучу, у якую самка на працягу шасці месяцаў кожны тыдзень адкладвае па адным яйку. Увесь гэты час самец правярае тэмпературу сваёй дзюбай. І нават рэгулюе яе, дабаўляючы альбо адкідаючы пясок. Такім чынам, у інкубатары падтрымліваецца пастаянная тэмпература ў 33 градусы.

### ДЫХАННЕ ПАД ВАДОЙ

Людзі з дапамогай аквалангу застаюцца пад вадой на працягу адной гадзіны. Некаторыя вадзяныя жукі робяць гэта прасцей і пры гэтым больш доўгі час знаходзяцца пад вадой. Прыхапіўшы паветраную бурбалку, яны пагружаюцца з ёй у ваду. Бурбалка служыць у якасці лёгкага: яна прымае ад жука вуглякіслы газ і выпускае яго ў ваду, а з вады забірае распушчаны ў ёй кісларод, каб жук мог дыхаць.

### ГАДЗІННІК

Жывыя арганізмы валодалі дакладным гадзіннікам задоўга да таго, як чалавек пачаў вызначаць час па сонечным гадзінніку. Падчас адліву мікраскапічныя водарасці дыятамеі падымаюцца на паверхню мокрага берагавога пяску. Калі ж наступае прыліў, яны бляднуць і хаваюцца ў свае норкі. У лабараторыі, якая знаходзіцца далёка да мора, яны працягваюць трымацца таго ж рэжыму, цямнеючы і святлеючы ў залежнасці ад часу адліву і прыліву. Ад мікраскапічных раслін да чалавека — паўсюль адлічваюць час мільёны ўнутраных гадзіннікаў.

### ПАДВОДНЫЯ ЛОДКІ

Падводныя лодкі існавалі таксама да таго, як іх вынайшлі людзі. Мікраскапічныя радыялярыі маюць у сваёй пратаплазме кропелькі алею, пры дапамозе якіх яны рэгулююць сваю вагу і дзякуючы чаму падымаюцца альбо апускаюцца ў моры. Рыбы мяняюць сваю плавучасць тым, што ўпускаюць у свой плавальны пузыр газ альбо выпускаюць яго.

Усё, што чалавек пераймае ў жывёл, нагадвае аб парадзе, якую дае Біблія: "Спытай у жывёлы, і навучыць цябе, у птушкі нябёснай, і апавясціць цябе; альбо пагутары з зямлёй, і наставіць цябе, і скажуць табе рыбы марскія. Хто ва ўсім гэтым не пазнае, што рука Госпада здзейсніла гэта?" (Іоў. 12, 7-8).

*Падрыхтавана "Праваслаўнай ініцыятывай"*

# Беларусазнаўства – дысцыпліна светапогляду

У апошні час усё часцей разгортваюцца дыскусіі пра агульнанацыянальную ідэю дзяржаўнага будаўніцтва. Праўда, пакуль што — толькі пра пошукі яе. Пагадзіліся на адным: нам трэба ўсім разам агульнымі намаганнямі выпрацаваць агульнадзяржаўныя ідэалагічныя падыходы да жыцця, паказаць галоўныя маральныя пастулаты, раскрыць філасофію нашага паўсядзённага побыту і быцця, засяродзіць увагу на матэрыяльных і духоўных каштоўнасцях сучаснага грамадства. Задача складаная, але, думаецца, вырашальная.

І тут мне хочацца паўтарыць тое, пра што даводзілася ў свой час пісаць у газеце "Звязда" ў артыкуле "Лабараторыя дэмакратыі" з падназвай "Як нам рэарганізаваць вышэйшую школу?". Многія з тых канкрэтных пунктаў, якія там прапаноўваліся, сёння рэалізуюцца ў дзейнасці ВНУ, напрыклад, самафінансаванне факультэтаў і іншыя, але робіцца гэта пад націскам часу, ледзь не самапрымусам, а не тады, калі гэта прапаноўвалася.

Галоўная думка ў тым артыкуле: "Універсітэты адказваюць за стан грамадства ў краіне". Можа таму распаўся саюз раўнапраўных рэспублік, што кіруючыя кадры ў вытворчасці і ў духоўным жыцці мы "кавалі" па запатрабаванні? Часам гэта рабілася за тры-чатыры гады мэтавым назначэннем праз рабфакі, паскоранымі тэмпамі ў пасляваенны час. Іншым разам гэта было апраўдана — дзецям вёскі дабаўлялі два балы пры паступленні, каб яны маглі канкурыраваць з больш падрыхтаванымі выпускнікамі гарадскіх і спецыялізаваных школ. З універсітэтаў у свой час усё і пачалося. Не дзіўна, гэта былі не толькі адукацыйныя ўстановы, але і цэлыя навукова-культурныя пасяленні "рэспублікі вучонасці", гарады ў гарадах, якія аказвалі велізарнейшы ўплыў на жыццё ўсёй краіны. Не кожны з нас нават і сёння можа пахваліцца тым, што пабываў у магутным яшчэ з часоў сярэднявечча універсітэце. Мне давялося яшчэ на пачатку 90-х гадоў пабываць у Кембрыджы (Вялікабрытанія). Здаецца, што там няма сталага, а тым больш пажылога насельніцтва, бадай што апроч шаноўнай прафесуры ў чорных ці сініх аксамітавых мантыях. Кембрыдж — горад студэнтаў. Адны студэнты, нікога апроч студэнтаў: з кніжкамі і без кніжак, з канспектамі, з ранцамі за плячыма ці з партфелямі і дыпламатамі ў руках, на веласіпедах ці пешшу, бо на машыне па тых завулачках не надта праедзеш. Міжволі прыгадваецца студэнцкая гарэзлівая песня XVII стагоддзя:

От зари до зари<br>Чуть зажгут фонари<br>Всё студенты по улицам шляются...

Кожны каледж уключае збудаванні замкнутага палацавага тыпу з лужком — вечна зялёным густым газонам пасярэдзіне: аўдыторыі для заняткаў, спортзалы, інтэрнат, актавыя залы, клубы, студэнцкія сталовыя. Мы не можам пахваліцца наяўнасцю такіх студэнцкіх гарадоўрэспублік, але яны могуць вырасці ў нас, у цэнтры Еўропы, дзе-небудзь паміж Мірам, Нясвіжам, Навагрудкам, пад Полацкам. Але і сёння нашы універсітэты могуць зрабіць многае.

У сістэме агульнагуманітарнай падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай кваліфікацыяй беларусазнаўства як вучэбная дысцыпліна і інтэгруючая навука аб Беларусі і беларусах павінна заняць асаблівае месца.

Аргументаваць гэта можна шматлікімі фактарамі. Па-першае, гэта цесна звязана з неабходнасцю самапазнання і выхавання самасвядомасці грамадства, кожнага чалавека. Па-другое, гэта можна звязаць з імкненнем да самасцвярджэння нацыі. Кожны народ павінен ведаць сваю гісторыю, сваю культуру, сваю адметнасць ад іншых, каб мацней яднацца, каб выжыць, выканаць сваю гістарычную місію, не прапасці ў вялізным моры іншых народаў.

Беларусазнаўства — навука тыпалагічная. Яно раскрывае беларускі культурна-гістарычны тып, які шматгранна выявіўся ў этнічнай творчасці. У формах самых розных — старадаўняя міфалогія, фальклор, моватворчасць, народныя святы, абрады, звычаі, духоўныя традыцыі, а таксама ў формах мастацкай прафесійнай культуры, філасофіі, эканомікі, дзяржавы і права, навукі і асветы. Якраз тое, што пры пэўнай разнастайнасці засталося пастаянным, падвалінным, стабільным, асноватворным, інварыянтным — дзякуючы чаму і ўзнаўляецца беларуская этнічная, а пазней і нацыянальная ментальнасць.

Іншымі словамі, беларусазнаўства — гэта лад і склад быцця і думак, светаўспрыманне і стан душы беларуса. Беларусазнаўства — гэта вывучэнне ўзаемасувязей макракосмасу (прыроды) і мікракосмасу (чалавека).

Можна выкласці асноўныя функцыі навучальнай дысцыпліны ў форме своеасаблівых крытэрыяў. Назавем іх патрабаваннямі да зместу навучальнага курса "Беларусазнаўства".

І. Абгрунтаванне неабходнасці дысцыпліны, яе месца ў навучальным працэсе: а) пашырыць гуманітарную адукацыю студэнтаў; б) раскрыць самабытнасць беларускага народа; в) пазнаць саміх сябе, грамадства, асэнсаваць ролю і месца краіны ў сусветным супольніцтве.

ІІ. Мэты выкладання дысцыпліны: а) садзейнічаць паглыбленню самапазнання ў студэнтаў; б) выхоўваць адказнасць за лёс Бацькаўшчыны.

ІІІ. Задачы вывучэння дысцыпліны: а) паказаць гістарычны шлях беларускага народа і фарміраванне яго свядомасці; б) раскрыць сучасны эканамічны, сацыяльны, культурны і палітычны стан у Беларусі.

IV. У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны: 1) ведаць: а) асаблівасці народнага характару беларусаў, беларускі менталітэт; б) асноўныя традыцыі, святы і абрады ў Беларусі; в) дынаміку развіцця беларускай культуры; г) варыянты паходжання назвы "Белая Русь", асноўныя этапы этнічнай гісторыі Беларусі; д) жыццё нацыянальных меншасцей у Беларусі; е) пра Беларусь і беларусаў у свеце; 2) умець: а) пранікаць у сацыяльныя і этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў; б) заглыбіцца ў праблемы этнагенезу беларусаў; в) адрозніваць жыццёвае асяроддзе беларусаў, адметнасці беларусаў; г) разбірацца ў канфесіях у Беларусі; д) разумець вытокі правасвядомасці беларусаў, жыцця "па законе продкаў", характар патрыятызму і вернасці Радзіме.

V. Пералік дысцыплін, якія неабходна засвоіць студэнтам дзеля вывучэння гэтага курса: а) беларуская мова; б) культура маўлення; в) гісторыя Беларусі; г) беларускі фальклор; д) этнаграфія Беларусі.

Беларусазнаўства — аснова светапогляду, светаўспрыняцця, светаразумення. Без гэтага немагчыма выхаванне асобы. Сёння нам неабходны навуковыя даследаванні менавіта абагульняючага, інтэгруючага, сінтэзуючага характару, якія дазваляюць не толькі глянуць на шматвяковы духоўны вопыт народа, але і адкрыць новыя законы неўміручасці нацыі.

Таму ў беларусазнаўстве шырока выкарыстоўваюцца ўжо не на ўзроўні фактаў, а на глыбіні аналітычнага асэнсавання веды з іншых гуманітарных і сацыяльных навук: мовазнаўства і літаратуразнаўства, псіхалогіі, этнаграфіі, геаграфіі, эканомікі і інш. Ніводная з гэтых дысцыплін не ў стане самастойна даследаваць народ ва ўсіх праявах яго характару. Усё гэта становіцца прадметам вывучэння ў курсе беларусазнаўства.

Падагулім сказанае. Беларусазнаўства — своеасаблівая нацыянальная філасофія, інтэгруючы курс, уводзіны ў гуманістыку — сістэму ведаў пра чалавека і чалавечае грамадства. Беларусазнаўства як вучэбная дысцыпліна будзе спрыяць пашырэнню гуманітарнай адукацыі студэнтаў, паглыбленню самапазнання, дапаможа выхаванню адказнасці ў кожнага спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі за лёс Бацькаўшчыны.

*Уладзімір НАВУМОВІЧ,*<br>*загадчык кафедры беларусазнаўства БДУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, член Саюза беларускіх пісьменнікаў*

# ІМЯ ПАЭТА НА ГЕАГРАФІЧНАЙ КАРЦЕ

Наўрад ці знойдзецца імя, так шырока адзначанае на геаграфічных картах, як светлае імя Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна. Пераважна імя вялікага паэта звязана са шматлікімі населенымі пунктамі, але ёсць назвы і сярод геаграфічных аб'ектаў.

У гарах Малога Каўказа ёсць Пушкінскі перавал — праз Базунскі хрыбет у Арменіі. Тут у 1829 годзе па дарозе ў Арзрум паэт сустрэў павозку з Персіі з целам забітага А.С. Грыбаедава. Каля высакагорнай крыніцы на скале ўстаноўлены барэльеф з выявай сумнай сустрэчы.

У гарах Вялікага Каўказа ў Бакавым хрыбце Кабардзіна-Балкарыі паміж вяршынямі Дых-Таў (5203 м) і Коштан-Таў (5151 м) размешчана вяршыня Пушкіна



Алея Керн. Міхайлаўскае

(5100 м). Назву далі альпіністы пасля пакарэння ў 1938 годзе. Тут у межах Галоўнага і Бакавога хрыбтоў знаходзіцца самая высокая (звыш 5000 м) вобласць Вялікага Каўказа, з найвышэйшай вяршыняй Еўропы — Эльбрусам (5633 м).

На Крымскім узмор'і скалісты мыс Аю-Дага ў Гурзуфе носіць імя паэта (тут Пушкін жыў у жніўні 1820 года), а ў воды Японскага мора ўрываецца яшчэ адзін Пушкінскі мыс, дзе паэт ніколі не быў — гэта ўжо ад удзячнага пачуцця нашчадкаў да вялікага паэта.

А колькі гарадоў і проста населеных пунктаў названа ў гонар Пушкіна? Гэты спіс па праве адкрывае горад Пушкін Ленінградскай вобласці (былое Саарскае Сяло, з 1724 года — сяло Благавешчанскае, з 1728 года — Царскае Сяло, з 1917 года — Дзіцячае Сяло і з 1937 года — горад Пушкін); кожны куток Царскага Сяла, якое атрымала статус горада ў 1808 годзе, апеты паэтам. Тут вылучаецца велізарны (па фасадзе 300 м) Кацярынінскі палац у стылі барока па праекце Растрэлі. У год смерці А.С. Пушкіна да горада была падведзена першая ў Расіі чыгунка, а ў будынку Царскасельскага ліцэя зараз знаходзіцца Усерасійскі музей А.С. Пушкіна.

Пушкінскія Горы ў Пскоўскай вобласці, у 112 км на паўднёвы ўсход ад Пскова, — дзяржаўны музей-запаведнік А.С. Пушкіна (з 1922 г.). Па маляўнічых лясістых пагорках раскінуліся асобныя часткі гэтага паселішча: Міхайлаўскае, Трыгорскае і Пятроўскае, гарадзішча Вароніч і Святагорскі манастыр з магілай пэта.

На карце Ніжагародскай вобласці імя паэта адзначана тры разы: чыгуначная станцыя каля горада Дзяржынска і два пасёлкі ў Першамайскім і Пачынкаўскім раёнах (былы Лукаянаўскі павет, на землях якога знаходзіўся родавы маёнтак Пушкіных Болдзіна, зараз музей-запаведнік Вялікае Болдзіна). У суседняй Мардовіі ёсць пасёлак Пушкіна і вёска Пушкіна, названыя ў гонар наведвання паэтам гэтых мясцін.

У гонар паэта названы гарады і пасёлкі ў Цвярской, Смаленскай, Разанскай, Уладзімірскай і Саратаўскай абласцях, у Кузбасе, у Алтайскім і Прыморскім краях і многіх іншых месцах Расіі, а таксама ў Казахстане і Азербайджане, Малдавіі і Украіне...

Аб назвах плошчаў і вуліцаў у гонар паэта казаць не даводзіцца, іх незлічонае мноства. Адзначым толькі два гарады — Маскву і Пецярбург. У Маскве — Пушкінская плошча (да 1931 года Страсная) з вядомым помнікам паэту скульптара А. Апякушына, Пушкінская вуліца (да 1937 года Вялікая Дзмітраўка) і Пушкінская набярэжная (да 1937 года Няскучная з Няскучным садам). У Пецярбургу — Пушкінская плошча (да 1937 года Біржавая) і Пушкінская вуліца (да 1884 года Новая, на якой у тым годзе быў пастаўлены першы помнік паэту).

Трэба памятаць, што шэраг населеных пунктаў з назвай Пушкіна не мае дачынення да паэта, а звязваецца з імёнамі яго продкаў (род Пушкіных, рускіх баяраў і дваранаў па бацькоўскай лініі паэта, вядомы з чатырнаццатага стагоддзя): адна вёска ў Ніжагародскай вобласці, дзве ў Мардовіі і яшчэ адна ў Ліпецкай вобласці. Найбольш імянітыя пункты змяшчаюцца ў Падмаскоўі — тут цэлае сузор'е тапоніма Пушкіна; маёмасці продкаў паэта былі тут яшчэ ў пятнаццатым стагоддзі і існавалі аж да рэвалюцыі 1917 года: Пушкіна ў 30 км на поўнач ад Масквы, Пушкіна ў 16 км ад Нагінска, Пушкіна-Аляксандраўскае ў 21 км ад Масквы, Пушкіна ў 26 км ад Падольска (усяго дзевяць тапонімаў).

Пушкін і геаграфія — асаблівая тэма. У велізарнай бібліятэцы паэта (больш за 3500 тамоў) кожная дзесятая кніга была геаграфічнага зместу. Сярод іх былі і рэдкія: "Маскоўская рэспубліка і гарады" (1630), "Апісанне Сібірскага царства"



Г.Ф. Мілера (1750), "Апісанне зямлі Камчаткі" С.П. Крашаніннікава (1786), "Тапаграфічныя звесткі, якія служаць для поўнага геаграфічнага апісання Расійскай імперыі" ў чатырох тамах (1771–1774), "Землеапісанне Расійскай імперыі" ў шасці тамах (1810) і многія іншыя. Былі кнігі і на замежных мовах: нямецкай, англійскай, французскай, італьянскай, іспанскай і нават сербскай. Большая частка кніг адносілася да геаграфіі асобных частак Расіі — Поўначы і Сібіры, Украіны і Беларусі, Каўказа і Сярэдняй Азіі. Больш за ўсё было кніг аб усіх найважнейшых на той час падарожжах, перадусім расійскіх (Крузенштэрна, Белінсгаўзена, Літке, Кацэбу, Галаўніна, Шэлехава, Паласа, Ляпёхіна і інш.). Пушкін марыў аб падарожжах, збіраўся ехаць у Кітай з вядомым кітаязнаўцам М. Бічурыным і вельмі пакутаваў ад таго, што быў "невыязным". У яго бібліятэцы быў "Атлас Расійскі" (1745), а насценныя геаграфічныя карты Расіі былі нават у Міхайлаўскім і Болдзіне. Захаваліся яго выпіскі па геаграфіі на 16 мовах, моўная эрудыцыя пашырала яго энцыклапедычныя веды аб Зямлі.

У вершах і прозе Пушкіна адзначаюцца геаграфічныя аб'екты літаральна ўсіх мацерыкоў і акіянаў; у Беларусі (у Пушкіна "Літва") прыгадваюцца рэкі Буг, Дняпро, Нёман і гарады Магілёў, Віцебск, Полацк, Орша, Мінск, Мсціслаў і інш.

Паэт двойчы быў у Беларусі. Першы раз ён праязджаў па беларускіх дарогах у маі 1820 года, накіроўваючыся ў ссылку на поўдзень Расіі. Другі раз — у жніўні 1824 года праездам з Адэсы ў новае месца ссылкі, Міхайлаўскае. Уражанні ад Беларусі знайшлі адлюстраванне ў аповесці "Дуброўскі" (1832), створанай па дакументальных звестках з жыцця небагатага 22-гадовага беларускага шляхціча Віцебскай губерні Паўла Астроўскага. Цікавы яшчэ і той факт, што кіраваў маёнткам Болдзіна беларус Восіп Мацвеевіч Пяньκоўскі, і Пушкін быў з ім у даверных адносінах...

Нагадаем, што ў гонар паэта названы таксама кратэр на планеце Меркурый, астэроід, мінерал пушкініт... Гэта толькі частка ў акіяне геаграфічных назваў у гонар А.С. Пушкіна, і яшчэ не адно найменне папоўніць гэты акіян у сувязі з 200-годдзем з дня нараджэння паэта.

*В.А. ЯРМОЛЕНКА,*
*доктар геаграфічных навук*

# ПАДУШКА З НЕФРЫТУ

Сярод мноства царстваў каменнае — казачна прыгожае, але ў той жа час самае таямнічае. Падчас "вандроўкі" па музеі землязнаўства ад вітрыны да вітрыны маем магчымасць сустрэцца з героямі царства і раскрыць некаторыя яго сакрэты. Запрашаем на хвілінач-



ку спыніцца ля суквецця зялёных камянёў, вось яны, ужо знаёмыя нам — ізумруд, хрызапраз, малахіт... Побач месціцца цэлая калекцыя камянёў з агульнай назвай — нефрыт. У музеі знаходзіцца амаль сотня ўзораў гэтага каменя — у пераважнай большасці ўзоры сібірскія (Усходнія Саяны), ёсць і кітайскія.

Па мінералагічнай класіфікацыі нефрыт з'яўляецца валакністай скрытнакрышталёвай разнавіднасцю трэмаліту-актыналіту. Колер часцей зялёны, сустракаецца белы і амаль чорны. Хімічная формула актыналіт-нефрыту (часцей сустракаецца ў прыродзе) — $Ca_2Fe_5[Si_4O_{11}]_2(OH)_2$. Зялёны колер нефрыту можа быць светлы альбо цёмны з рознымі адценнямі: яблычным, шараватым, травяністым, ізумрудным, аліўкавым, жаўтаватым і інш. Залежыць ён ад наяўнасці жалеза і прымесяў хрому, нікелю, марганцу. Назва паходзіць ад грэчаскага "нэфрас" — нырка. Згодна са старажытным павер'ем, нефрыт памяншаў ныркавыя колікі, калі яго прыкладалі да балючага месца. Цвёрдасць невялікая (5,5 — 6,5 па шкале Маоса), але камень вельмі цвёрды, бо разбіць яго амаль немагчыма. А.Я. Ферсман распавядае аб тым, як валун сібірскага нефрыту паклалі на кавадла пад паравы молат. Кавадла пасля ўдару рассыпалася на кавалкі, а камень застаўся без змянення. Сакрэт заключаецца ў тонкім перапляценні крышталікаў актыналіту, якія забяспечваюць высокую трываласць, у два разы большую, чым у сталі. Доўгі час нефрыт не маглі адрозніць ад жадэіту, хаця камяні маюць розную структуру. Жадэіт крышталічны і мае іншыя фізічныя паказчыкі.

На пачатку культурнай цывілізацыі разам з крэменем нефрыт быў прыладай барацьбы чалавека за жыццё. З яго выраблялі нажы, наканечнікі для стрэл, малаткі і сякеры, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне многія стагоддзі і не зношваліся. Такія працоўныя і паляўнічыя прылады былі ў старажытных народаў Цэнтральнай Азіі, Еўропы, Амерыкі, Новай Зеландыі і Аўстраліі. Нават у эпоху Вялікіх геаграфічных адкрыццяў на Новай Гвінеі малаткі і сякеры былі яшчэ нефрытавымі.

Высокая трываласць і прывабнае прасвечванне нефрыту дазваляе вытачыць складаныя, ацэненыя на "выдатна" цудоўныя вырабы. Высокай мастацкай вышыні дасягнулі майстры ў Кітаі. Нефрыт наогул у гэтай краіне шануюць і паважаюць, і зараз ён там лічыцца свяшчэнным. Для падкрэслівання найвышэйшых уласцівасцей, добрай якасці выкарыстоўваюцца словы "нефрытавая прыгажосць", "нефрытавая вартасць" і інш. Выраблялі з нефрыту культавыя і рэлігійныя прылады. Парныя пласцінкі нефрыту служылі пашпартам для пасланцоў імператара, а невялікія кавалачкі-пячаткі былі грашыма. З нефрыту выраблялі мноства музычных інструментаў-літафонаў. Пры ўдары каменныя пласцінкі ўтвараюць прыемныя гукі. У кітайскіх музеях можна ўбачыць нават падушкі з нефрыту. Лічылася, што такая падушка забяспечвае добры сон. Камень увасабляў міласэрнасць, справядлівасць, мудрасць і сціпласць. У "Белым кітайскім манастыры" (асноўны цэнтр даоскай рэлігіі) захоўваецца высечаная з цэльнага кавалка нефрыту фігура найвышэйшага жраца — імператара Юй Хуана. Пячатка Вялікага Чынгізхана была нефрытавай — у выглядзе фігуркі тыгра. Надмагільны помнік Тамерлана ў Самаркандзе — таксама з нефрыту. Дар каманды Кітая Аргкамітэту Сеульскай алімпіяды 1988 года — зноў-такі нефрыт.



Удзячная чалавечая памяць захоўвае унікальныя вырабы з нефрыту. Амаль трохтонная нефрытавая глыба з вобразам маарыйскага воіна, што выконвае баявы танец, знаходзіцца ў Музеі гісторыі ў Нью-Йорку. Там жа захоўваюцца каля 300 узораў нефрыту са старажытных кітайскіх пахаванняў. Рытуальныя ацтэкскія маскі і вырабы Пецяргофскай гранільнай фабрыкі, тыбецкія буды і новазеландскія хеі-тыкі і многія іншыя нефрытавыя скарбы шырока прадстаўлены ў музеях Парыжа, Лондана, Масквы, Санкт-Пецярбурга, Екацярынбурга.

У Расіі на Пецяргофскай гранільнай фабрыцы з кітайскага, а пасля з саянскага нефрыту выраблялі цудоўныя дэкаратыўныя вазы, кубкі, статуэткі, пісьмовыя прылады, ювелірныя ўпрыгожанні. Мноства такіх вырабаў захоўваецца ў Дзяржаўным Эрмітажы Расіі. Зараз камень уваходзіць у моду, на міжнародных выставах усё часцей і часцей можна ўбачыць цудоўныя вырабы з нефрыту.

Найбольш знакамітыя радовішчы сустракаюцца зараз у Кітаі, карэнныя нефрытавыя залежы ёсць на Паміры. Буйныя радовішчы ёсць у Аўстраліі, Новай Зеландыі, ЗША, Польшчы. Асноўнае радовішча нефрыту на Усходнім Саяне было адкрыта ў 1896 годзе.



Знаходка каменя была апісана яшчэ ў 1851 годзе Г.М. Пярмікіным, які тады даставіў у Іркуцк 1200 кг нефрыту ў дванаццаці валунах, 400 кг — у адзінаццаці і 800 кг — у адным цэльным валуне. Сустракаецца гэты камень яшчэ на Паўднёвым Урале і ў басейне ракі Віцім. З 1969 года здабываецца нефрыт у Канадзе (радовішча лічыцца адным з буйнейшых у свеце).

Атрымаць больш падрабязную інфармацыю і бліжэй пазнаёміцца з калекцыяй нефрыту можна ў музеі на геаграфічным факультэце. Два разы аўтару гэтага артыкула пашчасціла пабываць на радзіме сібірскага нефрыту, пазнаёміцца з цудоўнымі майстрамі (сярод іх ёсць і беларусы), што працуюць на фабрыцы "Байкалкварцсамацветы". Гэтая мясціна недалёка ад Іркуцка ў пасёлку Смаленшчына. Адтуль прывезены прыгожыя вырабы і ювелірныя ўпрыгожанні з нефрыту, якія зараз захоўваюцца ў "каменным храме" БДУ.

*Валянціна СМАЛЯКОВА,*
*геолаг музея землязнаўства БДУ*

*На фотаздымках: вырабы з нефрыту.*


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*
*Ум. друк. арк. 1*
*Падпісана да друку ў 12.00*

*20 МАЯ*
*Зак. 398.*
*Т. 1000 экз.*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 2206827.*

**Рэдактар М.Г. ЗАГОРСКАЯ**

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*

*Камп'ютэрная вёрстка П. Крышаловіча*